


● Законы нашага жыцця ● Старт Усесаюзнага конкурса ● Праверка экзаменам ● У партарганізацыях факультэтаў ● ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ ● В'етнамскі характар ● ДТСААФ крочыць уперад

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 39 (650) Пятніца, 23 снежня 1966 года Год выдання XX. Цана 2 кап.

## Форум народных выбраннікаў

19 снежня ў Вялікім Крамлёўскім палацы закончыла работу другая сесія Вярхоўнага Савета СССР сёмага склікання. Вярхоўны Савет аднагалосна прыняў законы аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР, аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1967 год і зацвердзіў справаздачу аб выкананні Дзяржаўнага бюджэта СССР за 1965 год. На сесіі папоўнен склад Канстытуцыйнай Камісіі, зацверджаны ўказы Прэзідыума Вярхоўнага Савета.

У той жа дзень у Крамлі Н. В. Падгорны ўручыў ордэн Леніна і медаль «Залатая Звязда» Героя Савецкага Саюза Генеральнаму сакратару ЦК КПСС Л. І. Брэжневу. Гэтага звання ён удастоен за заслугі перад Радзімай у сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння.




## Чырвоны Кастрычнік

*Мы яму абавязаны,*
*Ён, як май, малады.*
*З ім навекі мы звязаны,*
*Як з зямлёю дубы.*

*Хай і восень сягоння,*
*Хай жаўцеюць лісты,*
*Ён ніколі не зжоўкне,*
*Ён чырвоны заўжды,*

*Бо крывёю бацькоўскай*
*Ён здабыты ў баях,*
*Яркай ленінскай зоркай*
*Асвятляе нам шлях.*

ЯЎГЕН ХВАЛЕЙ

## ВЫШЭЙ УЗРОВЕНЬ СТУДЭНЦКІХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ!

У мэтах глыбокага і творчага вывучэння студэнтамі рэвалюцыйных традыцый партыі і народа, ленінскай тэарэтычнай спадчыны, тэорыі і практыкі камуністычнага будаўніцтва і далейшага развіцця навукова-даследчай работы моладзі ў галіне грамадскіх навук калегія Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ вырашылі правесці Усесаюзны конкурс студэнцкіх работ па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечаны 50-годдзю Савецкай улады. Зыходзячы з гэтага, калегія Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і бюро ЦК ЛКСМБ прынялі адпаведную пастанову.

У нашай рэспубліцы першы тур конкурсу адбудзецца ў вышэйшых навучальных установах у студзені—сакавіку 1967 года. Пасля абмеркавання студэнцкіх работ на кафедрах, канферэнцыях рашэннем конкурснай камісіі навучальнай установы лепшыя працы прадстаўляюцца на рэспубліканскі агляд. Другі тур будзе праведзены ў красавіку—маі. Па яго выніках у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя Ул. І. Леніна 16—17 мая адбудзецца рэспубліканская навуковая студэнцкая канферэнцыя. У пастанове адзначаецца, што вылучаныя на конкурс матэрыялы павінны прадстаўляць сабой самастойна выкананыя студэнтамі даследаванні па актуальных праблемах грамадскіх навук, з выкарыстаннем твораў класікаў марксізма-ленінізма, грамадска-палітычнай літаратуры, мясцовых сучасных фактаў і канкрэтных сацыялагічных даследаванняў. Пажадана, каб студэнцкія работы змяшчалі ў сабе вывады і рэкамендацыі для практыкі ідэйнага выхавання, былі цесна звязаны з выбранымі спецыяльнасцямі, палітычнымі, філасофскімі і сацыялагічнымі пытаннямі навук.

Устаноўлена дзевяць прэмій міністэрства і шэсць прэмій ЦК ЛКСМБ. Акрамя таго, аўтары лепшых навуковых прац, рэктараты, кафедры грамадскіх навук і педагогікі, камсамольскія арганізацыі вышэйшых навучальных устаноў будуць узнагароджаны Ганаровымі граматамі і прэміямі — бібліятэчкамі твораў класікаў марксізма-ленінізма і выдатных педагогаў. Ад універсітэта ў склад рэспубліканскага аргкамітэта ўвайшлі прарэктар доктар філасофскіх навук В. І. Сцяпанаў, загадчык кафедры навуковага камунізма дацэнт М. Р. Круцько, доктар гістарычных навук прафесар М. Я. Шкляр, загадчык кафедры гісторыі КПСС доктар гістарычных навук У. М. Сікорскі, старшы выкладчык кандыдат філасофскіх навук Я. В. Пятушкова, выкладчык Р. Я. Рылюк. Камітэт узначальвае доктар гістарычных навук дырэктар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ І. М. Ігнаценка.

Па выніках рэспубліканскага конкурсу будзе выдадзен зборнік «Маладыя — Кастрычніку», а лепшыя працы будуць рэкамендаваны на Усесаюзны конкурс. Гэта ўжо трэці тур, які адбудзецца ў кастрычніку 1967 года ў форме навуковай канферэнцыі студэнцкай моладзі ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце.

Гэтыя пастановы шырока абмеркаваны ва універсітэце — у рэктараце, на партыйных сходах, на пасяджэннях кафедраў і вучоных саветах. Яны выклікалі вялікую цікаўнасць у студэнтаў. Многія з іх ужо выбралі самастойныя тэмы і працуюць над імі.

Пачэсны абавязак універсітэцкага студэнцтва — прыняць самы актыўны ўдзел у конкурсе, паказаць сваю палітычную сталасць, глыбокае веданне складаных і актуальных праблем грамадскіх навук, уменне паспяхова весці навукова-даследчую работу!

Вялікую ролю ў прапагандзе класічнай музыкі і дасягненняў нашай краіны ў музыкальнай культуры адыгрывае універсітэцкі аркестр народных інструментаў.

Фота А. Кадзета.



## СПАБОРНІЦТВА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У гэтыя дні на факультэтах праходзяць партыйныя сходы, на якіх абмяркоўваюцца пытанні аб падрыхтоўцы да святкавання 50-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. На сходзе гісторыкаў адзначалася, што факультэт ужо шмат зрабіў для выканання сваіх сацыялістычных абавязацельстваў. Разам з тым дакладчык прафесар Л. М. Шнеерсон і выступіўшыя ў спрэчках адзначылі, што факультэт адстае ў нагляднай агітацыі. Неабходна стварыць прыгожыя вітрыны аб гісторыках — удзельніках баёў за Савецкую Беларусь, аб тых выпускніках, якія праславілі сябе ў працы.

Цікавая гутарка аб ходзе выканання абавязацельстваў да юбілею адбылася таксама на фізічным, філалагічным і іншых факультэтах. Філолагі вырашылі да 50-й гадавіны Кастрычніка падрыхтаваць і выдаць такія навуковыя працы, як «Ул. І. Ленін і пытанні эстэтыкі публіцыстычнага слова», «Кастрычнік у мастацкай літаратуры», «З гісторыі рабселькораўскага руху» і іншыя. Да юбілеяў краіны і рэспублікі запланавана падрыхтаваць 125—150 цікавых студэнцкіх навуковых прац. Важнае месца ў пастанове сходу занялі пытанні вучобы студэнтаў, палітычнага выхавання. Камсамольская арганізацыя факультэта выступіла з ініцыятывай аб правядзенні злёту камсамольцаў факультэта, падшэфных прадпрыемстваў і школ на тэму «Эстафета пакаленняў да 50-годдзя Савецкай улады». Сход горача падтрымаў гэтую прапанову, адобрыў таксама план падрыхтоўкі літаб'яднаннем «Узлёт» зборніка вершаў.

Спаборніцтва факультэтаў за дастойную сустрэчу вялікага свята працягваецца.

Ул. БЛАКІТНЫ.

## СЕСІЯ ПАЧАЛА СВОЙ ПАДЛІК

Як і кожны год, сёлета на многіх факультэтах пачалі здаваць залікі і экзамены задоўга да сесіі. Так, сесія пачала свой рахунак. Добра стартавалі біёлагі. Пяцікурснікі атрымалі па асновах навуковага атэізму 25 выдатных адзнак і 30 добрых. У некаторым сэнсе можна сказаць, што ад іх не адсталі і першакурснікі. Каля двухсот юнакоў і дзяўчат здавалі свой першы ў вышэйшай навучальнай установе залік і здалі добра. Такія факты маюцца на гістарычным, фізічным і іншых факультэтах. Парадавалі сваіх выкладчыкаў выпускнікі- матэматыкі. Нядаўна абаранялі свае дыпломныя працы чатырнаццаць чалавек, і ўсе яны атрымалі вышэйшыя адзнакі. Дзяржаўная камісія рэкамендавала дзесяць работ для апублікавання ў навуковых часопісах.

Але ўжо ў першыя дні здачы залікаў і экзаменаў выявілася, што некаторыя студэнты, нават цэлыя групы, недобрасумленна аднесліся да вывучэння праграмных дысцыплін. Чацверты курс аддзялення журналістыкі ўжо заканчвае сваю апошнюю сесію, але яго прадстаўніца Людміла Шушкевіч яшчэ не атрымала ніводнай адзнакі ў залікоўцы. Не, яна рабіла спробу разам з усімі добра адказаць на пастаўленыя выкладчыкам пытанні. Але ці можна гэта зрабіць, калі, як кажуць, няма нічога за душой! Высветлілася, што Л. Шушкевіч не ведае пройдзенага матэрыялу, не можа адказаць на самыя элементарныя пытанні. Горш таго, дацэнты Р. В. Булацкі і М. С. Зярніцкі ў групе чацвёртага курса вячэрняга аддзялення журналістыкі, дзе было дваццаць чалавек, змаглі паставіць залік толькі... двум студэнтам. Гаворка ідзе пра спецкурс.

З другога «заходу» здалі залік некаторыя студэнты чацвёртага курса геолага-геаграфічнага факультэта па геаграфіі насельніцтва. Студэнтка Алексютовіч Тамара не ведала плошчы СССР, не змагла адказаць на пытанне, у чым выражаецца шчыльнасць насельніцтва. Дацэнт В. А. Навіцкі застаўся вельмі незадаволеным падрыхтоўкай гэтай групы да заліку.

Можна было б прывесці іншыя прыклады, але і гэтых дастаткова, каб усім студэнтам зрабіць для сябе належныя вывады. Трэба ўясніць сабе, што нельга адкладваць падрыхтоўку да экзаменаў на апошнія дні, ды і наогул, неабходна вучыцца не для адзнакі ў залікоўцы.

Пахвальна тое, што выкладчыкі прынцыпова і патрабавальна адносяцца да адказаў студэнтаў. Гэта сведчыць аб тым, што несумленным студэнтам не будзе ніякага спуску. Вучыцца на выдатна і добра — абавязак кожнага, і для гэтага ў нашым універсітэце ёсць усе неабходныя ўмовы.

Сесія пачала свой падлік. Жадаем усім студэнтам вялікіх поспехаў, а выкладчыкам — часцей быць сведкамі цікавых, глыбокіх адказаў.

Сесія пачала свой падлік

# НА І ДОБРА—АБАВЯЗАК КОЖНАГА



Радасна, што вось-вось пойдзеш працаваць на вытворчасць, і сумна, што развітваешся з любімым універсітэтам -так лічаць студэнткі-пяцікурсніцы матэматычнага факультэта Наташа Сідарава, Ніна Герасімава і Ларыса Расолава. Наш фотакарэспандэнт А. Кадзет сфатаграфаваў іх у час апошніх лабараторных работ, якія яны стараюцца выканаць толькі на выдатна. Для гэтага трэба ведаць складаныя матэматычныя вылічэнні. Вось і асвойваюць дзяўчаты прынцып працы «электроннага мозга».

## Дружны калектыў

*Тры месяцы прайшло з той пары, як мы сталі студэнтамі аддзялення журналістыкі. Як хутка праляцеў гэты час!..*

*Зараз перад намі — вялікае выпрабаванне — першая сесія ў вышэйшай навучальнай установе. Яна ўнясе свае карэктывы, дакладней — дасць ацэнку нашым ведам, права на далейшую вучобу. Задача гэта адказная і складаная. Паспяхова яе выканае той, хто сістэматычна рыхтаваўся да семінараў, уважліва слухаў лекцыі, старанна наведваў заняткі. Мне здаецца, што яна будзе не страшнай для «стажнікаў» Уладзіміра Маляўскага, Анатоля Астапава, Віктара Рахіненкі, Валерыя Рыдкага і «учарашніх» школьнікаў Ані Абрамавай, Мікалая Асінскага, Наташы Захаравай, якія сваёй старannай вучобай заваявалі павагу ўсяго калектыва. Акрамя таго, яны выступаюць і на старонках газет. Пішуць нядрэнныя матэрыялы.*

*Ёсць і «ціхія» студэнты, якія баяцца нават пальцам паварухнуць, калі выкладчык называе тое ці іншае пытанне на семінары. Палохае гэтую частку студэнцтва слова «сесія». Яны «крукам» сагнуўшыся сядзяць у бібліятэцы над вучэбнікамі, але хіба дагоніш учарашні дзень?*

*Увогуле, калектыў наш дружны, мы часта збіраемся разам і абмяркоўваем складаныя пытанні вучобы, дапамагаем адзін аднаму. Нездарама ж кажуць, што дзе моцная сяброўства, там і добры поспех. І мы зробім усё ад нас магчымае, каб паспяхова здаць залікі і экзамены і пасля з спакойнай душой адпачываць на канікулах.*

*Г. МАЦУК.*

**У нас у гасцях „Vita“**

# І НАШ ДЭКАН БЫЎ СТУДЭНТАМ

*Інтэрв'ю Ларысы Назаравай з П. Р. Пятровічам і Г. Г. Вінбергам рэдакцыя газеты «Vita» надрукавала ў апошнім нумары, як запрашэнне студэнтаў-біёлагаў прыняць удзел у вялікай гутарцы аб наведванні, формах і змесце лекцый, аб канспектаванні. Мы мяркуем, што студэнты ўсіх факультэтаў, прафесары, дацэнты, выкладчыкі і аспіранты выкажуць свае думкі па гэтых пытаннях і на старонках газеты «Беларускі універсітэт».*

Балючым месцам сучаснага студэнцтва з'яўляецца наведванне лекцый і, напэўна, іх канспектаванне. Нельга сказаць, што былі такія лекцыі, на якіх не прысутнічала ніводнага студэнта. Так, мы можам гэтым ганарыцца, такога яшчэ не бывала. І калі са ста прысутнічаюць восемдзесят—гэта ўжо, лічаць, не так дрэнна.

А што будзе з тымі, хто не прысутнічае? Іх будуць выклікаць у дэканат, з імі будуць доўга гутарыць на тэмы маралі і нават ўжываць некаторыя меры пакарання, якія... не многім дапамагаюць, таму што колькасць прагульшчыкаў не ўменшылася.

Але ж і наш дэкан таксама быў студэнтам! І ўсе прафесары, аспіранты і асістэнты! Як яны размяркоўвалі свой час?

І мы вырашылі спытаць у былых студэнтаў, ці прапускалі яны лекцыі і як вялі канспекты, калі вялі яны іх увогуле. Пытанні, вядома, пастаўлены рубам і на іх не адразу адкажаш. І вось мы ў кабінеце нашага дэкана.

— Ці былі вы студэнтам?

Павел Рыгоравіч сур'ёзна і чуць здзіўлена паглядзеў з-пад акуляраў і замарудзіўшы адказаў:

— Ну, вядома, быў. А чаму паўстала такое пытанне?

На наша другое пытанне «Ці прапускалі вы лекцыі?» Павел Рыгоравіч трохі падумаў і адказаў:

— Няўжо вы думаеце, што я гэта добра памятаю. Гэта было 32-34 гады таму назад.

Пасля невялікай паўзы ён дадаў:

— Не, я не памятаю.

Нажаль, нам так і не ўдалося даведацца і ніколі не ўдасца, як часта прапускаў Павел Рыгоравіч лекцыі і якія меры спагнання прымаў ён. Можа, дэкан ухіліўся ад прамога адказу на пытанне. А, можа, і сапраўды дэкану было цяжка ўспомніць, што было больш чвэрці века назад.

Вельмі цікавым быў адказ на пытанне аб вядзенні канспектаў:

— Канспекты я вёў заўсёды. Вялі іх усе. Прычым, канспекты былі камбініраванымі. На адной старонцы мы запісвалі лекцыі, а на другой змест прачытанай кнігі, дапаможніка. На падрыхтоўку да экзамена нам адводзілася ўсяго два дні. Сесія цягнулася 12 дзён. І хто не працаваў на працягу года, не мог вывучыць праграмны матэрыял. А калі маеш канспект, дакладны і сціслы, застаецца толькі падчытаць, успомніць.

Мы звярнуліся да прафесара Г. Г. Вінберга з тымі ж пытаннямі.

— Ці прапускалі Вы лекцыі?

— Бачыце, у наш час наведванне лекцый было вольным, і я не магу гаварыць аб тым, прапускаў я іх ці не.

— Ці на ўсе гэтыя лекцыі Вы хадзілі?

— Не, я хадзіў на тыя лекцыі, якія лічыў больш патрэбнымі.

Забягаючы трохі наперад, па ходу размовы прыводзім адказ на пытанне, якое наведванне лекцый з'яўляецца лепшым, вольнае ці абавязковае?

— Пры сучасных умовах лепш наведванне абавязковае, таму што студэнты адчуваюць абавязак, а пры вольным наведванні быў вялікі адсеў. Так, адсеў вялікі. Былі яшчэ так званыя вечныя студэнты.

— Ці ёсць цікавыя лекцыі і што Вы разумееце пад гэтым паняццем?

— Гэтае пытанне даволі складанае. І што такое цікавая лекцыя, я не змагу адказаць. Цікавыя лекцыі разумеюцца па-рознаму: і па форме, і па зместу. Адны лічаць галоўнай форму, другія — змест. Адгэтуль так многа розных думак і сцвярджэнняў. Але галоўнае, я лічу, з лекцыі трэба выносіць змест!

Ну, што ж! Застаецца толькі пажадаць нашым студэнтам рэгулярна наведваць лекцыі. Лекцыі пашыраюць наш кругагляд, даюць нам такія факты, якія самастойна мы не зможам адшукаць у кнізе. Трэба цаніць свой час і працу іншых людзей. І давайце паспрабуем весці камбініраваныя канспекты, якія, несумненна, скароцяць час падрыхтоўкі перад сесіяй.

**Л. НАЗАРАВА,**
**студэнтка першага курса біялагічнага факультэта.**

# МАЛАЙЦЫ, АТЭІСТЫ

Пяцікурснікі біяфака здалі першы экзамен сваёй апошняй сесіі-навуковы атэізм. І экзаменатар Альберт Максімавіч Камароў, і студэнты задаволены вынікам: з 55 здаваўшых 25 чалавек атрымалі «выдатна» і 30 — «добра». Сярод «пяцёрачнікаў» Н. Арцымоўская, С. Беразоўская, А. Вязіцкі, М. Кукарэка, Е. Лін, С. Федчанка і многія іншыя. Калі я запытала ў студэнтаў, як гэта ім ўдалося так выдатна вытрымаць экзамен, яны ледзь не пакрыўдзіліся: «А як жа інакш, мы ж біёлагі!».

На чарзе залікі па спецкурсах, да якіх рыхтуюцца пяцікурснікі ў перапынках паміж урокамі ў школе.

Не жадаю ім поспехаў, бо ўпэўнена: фініш будзе не менш паспяховым.

**Н. БАТУРЫЦКАЯ,**
**аспірантка біялагічнага факультэта.**

# НА ТРАСАХ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

**У пастанове Пленума ЦК КПСС, які адбыўся нядаўна, падкрэсліваецца, што партыя і надалей будзе павышаць пільнасць народа, усямерна ўмацоўваць абароназдольнасць нашай Радзімы. Важную ролю ў падрыхтоўцы савецкіх людзей да аховы сваёй мірнай працы, у патрыятычным выхаванні адыгрывае Добраахвотнае таварыства садзеяння арміі, авіяцыі і флоту, якім ахоплены мільёны грамадзян, праводзіцца вялікая работа па прапагандзе ваенна-тэхнічных ведаў, баявых рэвалюцыйных традыцый.**

**Нядаўна падвяла вынікі сваёй работы арганізацыя ДТСААФ у нашым універсітэце. Спаборнічаючы за дастойную сустрэчу 50-годдзя Савецкай улады, гэты шматлікі калектыў дабіўся значных поспехаў. Колькасць членаў арганізацыі таварыства ўжо перавысіла чатыры тысячы. Асабліва шматлікімі з'яўляюцца аб'яднанні на фізічным (1300 чалавек), матэматычным (900), філалагічным і хімічным факультэтах (амаль па 500 членаў). Іменна хуткі рост шэрагаў таварыства даў магчымасць камітэту ДТСААФ плённа выкарыстоўваць самыя разнастайныя формы выхаваўчай і арганізацыйнай работы. Гутаркі, тэматычныя вечары, сустрэчы студэнтаў з удзельнікамі рэвалюцыі, грамадзянскай і Айчыннай войнаў, экскурсіі па знамянальных мясцінах, падрыхтоўка стэндаў і выставак, выпуск газеты «Патрыёт», кіналекторыі — вось далёка не поўны пералік мерапрыемстваў, якія часта праводзяцца на факультэтах. Мы лічым, што вялікую выхаваўчую ролю адыгрываюць перасоўныя выстаўкі Беларускай ваеннай акругі. Яны былі прысвечаны 20-годдзю перамогі над гітлераўскай Германіяй, вызваленню Беларусі, памяці партызан, баявому шляху Савецкіх Узброеных Сіл. Цікавасць выклікаў турысцкі паход па месцах баявой і працоўнай славы Беларусі, а таксама спартыўныя спаборніцтвы, у якіх удзельнічалі дзесяткі студэнтаў.**

**Па галіне ДТСААФ ва універсітэце створана шэсць абаронных секцый. Усе яны запісалі на свой рахунак шмат перамог, добрых спраў. Так, стралковая секцыя ў мінулым навучальным годзе правяла дзесяць спаборніцтваў, у якіх прыняло ўдзел каля тысячы трохсот студэнтаў і навуковых супрацоўнікаў. У складзе гэтай секцыі маецца 178 разраднікаў. На выніковых раённых спаборніцтвах каманда нашага універсітэта заняла першае месца і заваявала пераходны Кубак. 290 шафёраў-аматараў і матацыклістаў падрыхтавала за справаздачны перыяд аўтамота секцыя. Парадавалі і універсітэцкія парашутысты. Праўда, у гэтай секцыі пакуль што недастаткова прадстаўлены ўсе факультэты. Ва універсітэце маюцца добрыя магчымасці на базе фізічнага факультэта падрыхтоўкі радыёспецыялістаў. Радыёспорт — спорт цікавы, і яго прадстаўнікі з нашай секцыі таксама занялі першае месца ў спаборніцтвах Ленінскага раёна. Мінулым летам члены ДТСААФ універсітэта з секцыі воднага спорту прайшлі на вёсельных шлюпках маршрут працягам 140 кіламетраў. Аматары воднага спорту ў асноўным займаюцца ў Рэспубліканскім марскім клубе.**

**Па выніках першага этапу агляду абаронна-масавай работы і патрыятычнага выхавання ў вышэйшых навучальных установах, агляду, прысвечанаму 50-годдзю Савецкай улады, пярвічная арганізацыя ДТСААФ заваявала першае месца ў раёне і вобласці і чацвёртае месца па рэспубліцы. Хочацца адзначыць добрыя вынікі фізічнага, матэматычнага і філалагічнага факультэтаў. Тут і партыйныя бюро і дэканаты вялікую ўвагу ўдзяляюць дзейнасці арганізацыі ДТСААФ, аказваюць сістэматычную дапамогу.**

**Аднак у нас ёсць яшчэ і шмат недахопаў. Асноўнай формай масавага авалодвання студэнтамі абаронна-тэхнічнымі спецыяльнасцямі з'яўляюцца гурткі, але на факультэтах іх яшчэ недастаткова. Гэта ў першую чаргу датычыцца стралковага спорту; ды і іншым секцыям трэба расці. Мы толькі напалову змаглі выканаць планы навучэння водных грабцоў. Неабходна, каб на кожным факультэце працавалі шматлікія гурткі, каб яны мелі добрыя ўмовы для падрыхтоўкі спартсменаў разраднікаў, значкістаў.**

**Дарэчы, аб матэрыяльна-тэхнічнай базе арганізацыі. Дзякуючы дапамозе рэктарата, парткома, мы маем шмат магчымасцей весці дзейсную абаронна-масавую работу і патрыятычнае выхаванне. Але сучасная матэрыяльна-тэхнічная база ўжо ў вядомай ступені не адпавядае ўзрослым запатрабаванням. Адчуваецца недахоп літаратуры, наглядных дапаможнікаў, разнастайнага вучэбнага і спартыўнага інвентару. Было б мэтазгодным, каб кожны факультэт стварыў і абсталяваў свой клас для падрыхтоўкі парашутыстаў. Дэлегаты канферэнцыі паставілі перад камітэтам ДТСААФ і універсітэцкімі арганізацыямі шмат іншых набалеўшых пытанняў. Іх трэба вырашаць для таго, каб задаволіць усе запатрабаванні моладзі. Нельга не згадзіцца з выступаўшымі, якія адзначалі, што камітэт камсамола, прафком і мясцком яшчэ недастаткова ўдзяляюць увагі рабоце арганізацыі ДТСААФ.**

**Канешне, асноўную нагрузку павінен несці камітэт ДТСААФ. Цяпер у яго склад увайшлі ініцыятыўныя людзі, якія любяць гэтую справу, ведаюць яе. Напрыклад, старшынёй камісіі па арганізацыйным пытанням абран генерал-маёр у адстаўцы А. В. Кірсанаў. Кіраўнік парашутнай секцыі — студэнт В. Озераў, выкладчык кафедры фізвыхавання В. Г. Хрэнаў і іншыя вядомыя спартсмены універсітэта сталі членамі камітэта.**

**Узнагарода Мінска ордэнам Леніна абавязвае арганізацыю ДТСААФ універсітэта палепшыць падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў, ідэйна загартаваных патрыётаў Радзімы.**

**М. БОНДАР,**
**старшыня камітэта ДТСААФ універсітэта.**

